**АСАТКІН-УЛАДЗІМІРСКІ** Аляксандр Мікалаевіч (15.10.1885, с. Вазнясенскае, Кастрамскі р-н — вер. 1937), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Маскоўскі камерцыйны ін-т. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. У 1918—21 чл. Прэзідыума ВЦСПС. У 1921 на дзярж. рабоце ў Туркестанскай АССР. З 1922 інструктар ЦК РКП(б). У маі 1923 узначаліў партыйна-ўрадавую камісію па ўзбуйненні БССР. З лют. 1924 сакратар *Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б)*. У маі—вер. 1924 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б. У 1924—29 старшыня праўлення Усесаюзнага с.-г. банка. З 1930 на сав., парт., дзярж. і навук. рабоце. У 1937 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.